дзяржаўнымі справамі, неабходна ведаць філасофію, гісторыю ды рыторыку. Дзякуючы філасофіі можна дакладна разважаць і бачыць галоўнае ў любой справе. Да таго ж, у ёй змешчаны абавязкі ўсіх людзей. Гісторыя, у сваю чаргу, прадстаўляе карысныя для пераймання прыклады. Пры дапамозе ж красамоўства чалавек здольны агучваць свае думкі перад публікай і такім чынам пераконваць людзей ва ўласнай праваце [7, с. IX, 29-73].

У цэлым, аналіз арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў айчынных пратэстанцкіх школах дазваляе зрабіць шэраг высноў. Па-першае, акцэнт у ім рабіўся на падрыхтоўцы сумленнага грамадзяніна, для якога інтарэсы дзяржавы павінны былі прэваліраваць над асабістымі. Па-другое, стварэнне Рэчы Паспалітай спрыяла карэкцыі ўспрымання сутнасці слова Айчына, пад якім разумелася ўся тэрыторыя краіны. Па-трэцяе, выхад значнай часткі тагачасных падручнікаў на польскай мове стаў праявай пачатку паланізацыі паўсядзённага жыцця ў Беларусі. Разам з тым, акцэнт у іх рабіўся ў тым ліку і на выхаванні “ліцвінскага” патрыятызму з прывіццём вучнёўскай моладзі гонару за слаўнае мінулае сваёй Радзімы, а таксама падкрэсліваннем роўнага палітычнага статусу ВКЛ ды “Кароны” (Польшча і Украіна).

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / уклад. У.Г. Кароткі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 308 с.

2. Katechizm, albo krotkie w iedno mieysce zebranie wiary y powinności Krześciańskiey, z Pasterstwem Zborowym y domowym, z Modlitwami, Psalmami y Piosnkami. – Wilno : Druk. J. Markowicza, 1600. – 920 s.

3. Barleti, M. Historia o żywocie i zacnych sprawach Jerzego Kastriota, którego pospolicie Szkanderbegiem zową, książęcia epireńskiego / M. Barleti. – Brześć Litewski : Druk. C. Bazylika, 1569. – XXXVIII, 745 s.

4. Demitrowicz, P. Compendium Abo Krotkie opisanie, tak Książąt y Krolow Polskich, iako spraw, przypadkow, y dawnych dzieiow Krolestwa Polskiego / P. Demitrowicz. – Lubcza : Druk. P. Blastusa Kmity, 1625. – 242 s.

5. Лыч, Л. Пратэстанцкая царква ў нацыянальна-культурным жыцці Беларусі : традыцыі і сучаснасць / Л. Лыч // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – 1999. – Т. 1. – С. 110-123.

6. Marka Tulliusa Cicerona O powinnościach wszech stanow ludzi Księgi troie przez S. Kosztutskiego przełozone y krotkiemi przypiskami obiaśnione. – Wilno : Druk. J. Karcana, 1593. – XXXV, 238 s.

7. Celichowski, Z. Marcina Kwiatkowskiego Książeczki rozkoszne o poczciwem wychowaniu dziatek, 1564 / Z. Celichowski. – Kraków : Druk. “Czas”, 1889. – XI, 99 s.

*І. І. Сацукевіч, магістр гісторыі,*
*БДЭУ, г. Мінск*
*ivansat@rambler.ru*

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ Ў ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ ВНУ ПОМНІКАЎ У ГОНАР ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў МІНСКУ

Памяць пра Вялікую Айчынную вайну сёння займае адно з найважнейшых месцаў у выхаваўчай рабоце ВНУ. Словы «генацыд», «халакост», «Хатынь», «Трасцянец» трывала ўвайшлі ў лексікон выкладчыкаў і студэнтаў. Традыцыйнымі сталі наведванні ў памятныя даты помнікаў і мемарыялаў, прысвечаных памяці трагедыі Вялікай Айчыннай вайны. Дадзены артыкул

сістэматызуе помнікі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску і паказвае новыя магчымасці выхаваўчай работы ў ВНУ.

Усе помнікі і мемарыялы Мінска, пастаўленыя ў гонар Вялікай Айчыннай вайны, можна падзяліць на 5 груп: 1) помнікі важнейшым падзеям Вялікай Айчыннай вайны; 2) помнікі гісторыі мінскага антыфашысцкага падполля; 3) помнікі халакосту; 4) помнікі на брацкіх магілах і месцах знішчэння насельніцтва; 5) персанальныя помнікі ў гонар удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Першая група складаецца з мемарыялаў і помнікаў, якія фіксуюць для нас найважнейшыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Асобныя помнікі гэтай групы добра вядомы мінчанам і гасцям нашай сталіцы. Найстарэйшым з іх з'яўляецца помнік-танк, пастаўлены ў гонар вызвалення Мінска Чырвонай арміяй ля Дома афіцэраў у 1952 г. Танк Т-34, які стаіць на гранітным пастаменце – помнік воінам-танкістам, якія першымі ўварваліся ў горад [1, с. 301]. Самы вядомы помнік, прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны – абеліск Перамогі, усталяваны на Круглай (з 1956 – Перамогі) плошчы ў 1954 г. У стварэнні абеліска Перамогі прымалі ўдзел архітэктары У. Кароль, Г. Заборскі і скульптары З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, С. Селіханаў. У 1984 г. на скрыжаванні сучасных праспектаў Пераможцаў і Машэрава з'явіўся абеліск “Мінск – горад-герой”, які падкрэсліў атрыманне ў 1974 г. Мінскам звання горада-героя [2, с. 46–47]. У 2004 г. на Партызанскім праспекце з'явіўся помнік-мемарыял “Беларусь партызанская”, які ўшаноўвае ўсіх беларускіх партызанаў (аўтар – В. Занковіч). У 2015 г. на тэрыторыі мемарыяльнага комплекса “Трасцянец” быў усталяваны галоўны манумент мемарыяла – “Брама памяці” (скульптар К. Касцючэнка) [4, с. 70]. У 2019 г. на тэрыторыі былога канцлагера “Пушкінскія казармы” усталявалі помнік ахвярам гэтага канцэнтрацыйнага лагера.

Асобную групу помнікаў складаюць манументы, якія нагадваюць пра гераічную барацьбу мінскага антыфашысцкага падполля. Самы першы помнік гэтай групы быў усталяваны ў 1979 г. у Аляксандраўскім скверы. Над ім працавалі скульптар А. Анікейчык і архітэктар Л. Левін. Помнік павінен нагадваць пра месца пакарання смерцю некалькіх падпольшчыкаў [2, с. 48]. На вуліцы Чыжэўскіх, на месцы, дзе былі пакараны смерцю Алена і Марыя Чыжэўскія і Надзея Маісеева, у 1981 г. быў усталяваны помнік (скульптар В. Занковіч). На вуліцы Кастрычніцкай ля прахадной дрожжавага завода знаходзіцца помнік-валун у гонар падпольшчыкаў, закатаваных нацыстамі 26 кастрычніка 1941 г. Некалькі помнікаў указваюць на месцы, дзе знаходзіліся канспіратыўныя дамы і кватэры мінскага антыфашысцкага падполля. Адзін з іх знаходзіцца на вуліцы Маякоўскага.

Трэцяя група помнікаў аб'яднана тэмай халакосту. Першы з іх быў усталяваны яшчэ ў 1947 г. на месцы пахавання ахвяраў мінскага гета – кар'еры, дзе да вайны здабывалі гліну. Там жа ў 2000 г. быў адкрыты мемарыял “Яма”, цэнтральнае месца ў якім займае скульптурная кампазіцыя, створаная архітэктарам Л. Левіным і скульптарам А. Фінскім. Яшчэ адзін помнік з'явіўся на галоўнай плошчы гета – Юбілейнай. На тэрыторыі былых яўрэйскіх могілак з'явіліся 9 камянёў у памяць пра дэпартаваных у Мінск яўрэяў з розных гарадоў Еўропы. Там жа знаходзіцца помнік “Зламаны ачаг” – сімвал разбурэння мірнага жыцця тысяч людзей [4, с. 19]. Непадалёк ад станцыі метро "Пушкінская", на вуліцы Прытыцкага, размешчаны помнік ахвярам мінскага гета. Усталявана работа Л. Левіна была ў 2008 г.

Чацвёртая група помнікаў указвае на брацкія магілы воінаў і месцы пахавання ахвяраў нямецка-фашысцкага рэжыму. Адзін з самых першых падобных помнікаў быў пастаўлены ў парку Чалюскінцаў у 1955 г. [2, с. 51]. На брацкай магіле па бульвару Талбухіна помнік з'явіўся ў 1963 г. У 1965 г. быў пастаўлены мемарыял на месцы гібелі 80 тысяч ваеннапалонных канцлагера “Шталаг № 352” у Масюкоўшчыне [3, с. 80–81]. На выездзе з Мінска ў бок Маскоўскай шашы размешчаны абеліск на месцы пахавання 30 тысяч ваеннапалонных ва ўрочышчы Карніч-балота. Некалькі гадоў таму на праспекце Дзяржынскага з'явілася скульптурная кампазіцыя “Памяць”, якая ўсталявана на брацкай магіле 35 савецкіх салдат.

Першы персанальны помнік у гонар удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску з'явіўся ўжо ў 1950 г. Тады на тэрыторыі Аўтазаводскага пасёлка быў пастаўлены помнік партызанцы Лізе

Чайкінай (скульптар А. Бембель) [2, с. 58]. У 1955 г. у парку 30-годззя БССР быў пастаўлены помнік першаму двойчы Герою Саецкага саюза лётчыку С. Грыцаўцу. Праз некалькі гадоў парк быў перайменаваны ў гонар Янкі Купалы, таму помнік С. Грыцаўцу быў перанесены на сучаснае скрыжаванне праспекта Незалежнасці і вуліцы Леніна. У 1959 г. у Піянерскім парку быў усталяваны помнік партызану-герою Марату Казею (скульптар С. Селіханаў). У гады незалежнай Рэспублікі Беларусь колькасць падобных помнікаў значна вырасла. Так, у мікрараёне Захад у 2005 г. на вуліцы Якубоўскага ўсталявалі помнік у гонар знакамітага палкаводца Івана Якубоўскага. На вуліцы Асаналіева з'явіўся помнік Герою Савецкага саюза Жумашу Асаналіеву. У 2007 г. побач з праспектам Жукава, у скверы імя Жукава быў пастаўлены помнік славутаму маршалу.

Можна зрабіць выснову, што ў Мінску знаходзіцца вельмі шмат мемарыялаў і помнікаў у гонар падзеяў Вялікай Айчыннай вайны. Іх колькасць і разнастайнасць ствараюць умовы для актыўнага выкарыстання іх у выхаваўчай рабоце ВНУ. Формамі выхаваўчай работы могуць быць экскурсіі, віктарыны, круглыя сталы, бяседы. Тэматычна гэтыя мерапрыемствы можна прысвяціць у тым ліку асобным тэмам Вялікай Айчыннай вайны – мінскаму антыфашысцкаму падполлю, партызанскаму руху, халакосту, вядомым палкаводцам і г.д.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Минск. Энциклопедический справочник. – Минск : Белорусская советская энциклопедия, 1983. – 467 с.

2. Шамов, В. П. Памятники Минска / В. П. Шамов. – Минск : Полымя, 1991. – 208 с.

3. Яцкевіч, Н. А. Масюкоўшчына. Трагедыя савецкіх ваеннапалонных / Н. А. Яцкевіч. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. – 128 с.

4. Яцкевіч, Н. А. Трасцянец. Трагедыя народаў Еўропы / Н. А. Яцкевіч. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 128 с.

*В.В. Шепетюк, кандидат философских наук, доцент,*
*БГУИР, г. Минск*
*shepetuk@mail.ru*

# МЕНТАЛЬНЫЕ ВЫЗОВЫ СОВРЕМЕННОСТИ И ИХ ВЛИЯНИЕ НА УЧЕБНУЮ И ВОСПИТАТЕЛЬНУЮ РАБОТУ

В настоящее время, в связи с постоянно растущим воздействием на человека информационно-коммуникационных технологий, возникает целый ряд проблем, а также вызовов и угроз, представляющих серьезную опасность для устойчивого развития обществ и государств. Процесс изучения свойств, характеристик и закономерностей проявления данных вызовов и угроз, которые, по сути, выступают частью глобальных цивилизационных рисков, на сегодняшний день продолжается. Вместе с тем, уже сейчас можно говорить о фиксируемых в исследованиях и аналитических материалах упоминаниях о так называемых ментальных рисках [1, 2, 3, 4], связанных с непредсказуемыми изменениями мышления, восприятия людьми окружающего мира под усиливающимся на них давлением цифровой (виртуальной, информационно-компьютерной) реальности и последствиями манипулирования такой реальностью. Данные негативные последствия проявляют себя во всех без исключения сферах общественной жизни, разрушая привычные алгоритмы социального взаимодействия и прогресса, дестабилизируя и внося значительную неопределенность в моделирование будущего. В рамках данной статьи остановимся на рассмотрении их деструктивного влияния на учебную и воспитательную работу с молодежью,